# Песня а князю Вітаўце

(гістарычная песня)

Тэмп марша

15-16 ст.




Едзе Вітаўт па вуліцы
За ім нясуць дзве шабліцы.
REF Слаўся князь Вітаўт
Гаспадар на Літве!

Шаблі літы, злотам біты
Ў яшчар-скуру апавіты.
REF

Адна шабля для спадара
Друга шабля на татара.
REF

Стануў Вітаўт прад кашовым
Бліснуў у сонцы шабляй новай.
REF

Стукнуў-грукнуў у падковы
Гэй шыхтуйся пан кашовы.
REF

Гэй шыхтуйся збройна, жвава
Дзе йдзе бітвы слаўна справа.
REF

Гукнуў кош ды з самапалаў
З сямі/пятых ад запалаў.
REF

Крыкнуў: "Слава, слаўны княжа
Вораг у полі косцю ляжа!"
REF

Copyright © Stary Olsa